Лойка, П. А. Гістарыяграфія праблемы вывучэння ролі шляхты ў грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай (другая палова XVI – першая трэць XVII ст.) / П. А. Лойка // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 3 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэдактар) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2008. – С. 46–52.

***П. А. ЛОЙКА***

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ ВЫВУЧЭННЯ РОЛІ ШЛЯХТЫ Ў ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (другая палова XVI — першая трэць XVII ст.)

Нацыянальная беларуская медыявістычная гістарыяграфія, пачатак якой можна акрэсліць 10—20-мі гг. XX ст., практычна не мела і не мае грунтоўных, комплексных распрацовак па краевугольных праблемах сярэднявечнай гісторыі Беларусі. Да такіх, безумоўна, неабходна аднесці пытанні станаўлення, эвалюцыі і трансфармацыі асноўных саслоўяў беларускага грамадства феадальнай эпохі: сялянства, мяшчанства, шляхты. Калі першаму з іх пашанцавала болей — ад У. І. Пічэты да першага тома абагульняючай «Гісторыі сялянства Беларусі»; другому крыху меней — але ўсё ж ёсць у наяўнасці грунтоўныя манаграфіі З. Ю. Капыскага, В. І. Мялешкі, А. П. Грыцкевіча; трэцяму — мізэрна.

Праблематыка шляхты не знайшла належнага адлюстравання ў айчыннай гістарыяграфіі. На першых кроках яе станаўлення, можна сказаць, у пачатковай фундаментальнай «Гісторыі Беларусі» класіка нацыянальнай гістарычнай навукі М. В. Доўнар-Запольскага былі адлюстраваны пытанні складвання шляхецкага саслоўя, афармлення яго правоў, удзел шляхты ў палітычным жыцці краіны з асобным сюжэтам аб дзейнасці сомікаў. Але выданне было падрыхтавана да друку ў 1918—1919 гг., а пабачыла свет толькі ў 1994 г.[1] Кожны з абзацаў твора 85-гадовай даўнасці на дзень сённяшні ўяўляе сабой тэзіс, прыдатны да разгортвання грунтоўнага навуковага даследавання.

Далей развіццё беларускай гістарычнай навукі, якое прыпадала на савецкі час, адбывалася без даследавання дзяржаўна-палітычнай дзейнасці сацыяльных вярхоў беларускага сярэднявечнага грамадства, што лічылася іншародным. Толькі ў 70—80-я гг. XX ст. фарміраванню і структуры шля-



хецкага саслоўя былі прысвечаны некалькі прац А. П. Грыцкевіча, якія ўбачылі свет у абагульняючых выданнях, зборніках артыкулаў і атрымалі працяг у публікацыях 1990-х гг.[2]

Да разгляду грамадска-палітычнай думкі другой паловы XVI — першай паловы XVII ст., якая выпрацоўвалася шляхецка-мяшчанскім асяродкам ВКЛ, звярталіся юрысты-прававікі-сацыёлагі (Я. А. Юхо, С. А. Падокшын, С. Ф. Сокал, С. Ф. Шалькевіч). У іх працах на грунце гісторыка-юрыдычнага і філасофска-сацыялагічнага аналізу раскрываюцца погляды і практычная дзейнасць асобных актыўных дзяржаўна-грамадскіх дзеячаў А. Вало- віча, К. Радзівіла, Л. Сапегі, А. Волана, Я. Кішкі, Л. Крышкоўскага, К. Астрожскага, Я. Абрамовіча, М. Стрыйкоўскага, М. Літвіна ды інш. У прыватнасці, увага канцэнтруецца на ацэнцы сутнасці дзяржавы, яе задач і функцый размеркавання ўлады (манарх — сойм і соймікі), канкрэтна-палітычныя праблемы (выбар манарха, прэрагатывы соймікавай улады падчас безкаралеўяў, дзяржаўныя ўзаемадачыненні двух пачаткаў — ВКЛ і Каралеўства Польскага — у Рэчы Паспалітай, грамадска-маральныя каштоўнасці)[3]. Да агульных высноў сутнасці дзяржаўна-палітычнага ладу трэба аднесці думку С. Ф. Сокала, што «пасля падпісання Люблінскай уніі палітычнае развіццё пайшло па шляху ўсталявання магнацкай алігархіі»[4]. Але аўтар, як і яго калегі, тут абмінаюць далёка не мізэрнае па часе 60—70-годдзе (з 60-х гг. XVI ст. па 20—30-я гг. XVII ст.), падчас якога ў парламентарызме ВКЛ быў зафіксаваны адзіны перыяд, калі дробная і сярэдняя шляхта была шмат у чым вызначальнай палітычнай сілай у дзяржаве, а ўжо потым (з 30—40-х гг. XVII ст.) да канца існавання Рэчы Паспалітай адыгрывала другарадную ролю ў палітычных рэкагнасцыроўках магнатэрыі.

Для вывучэння ідэалаў эпохі другой паловы XVI — першай трэці XVII ст., што адлюстроўвалі сацыяльна-маральны стан грамадства праз творчасць літаратараў з элітарнага саслоўя, звярталіся філолагі, якія аналізавалі гераіка-эпічную паэзію ВКЛ канца XVI — пачатку XVII ст. (Я. Радзівіла, А. Рымшы, Ф. Градоўскага, Г. Пельгрымоўскага, Л. Зізанія, Я. Казаковіча ды інш.). У працах С. В. Кавалёва, І. В. Саверчанкі[5] даецца ўяўленне аб падзеях як ў палітычным жыцці таго часу, маральных учынках сучаснікаў у адносінах да вернай адданасці Айчыне, службовай адказнасці, сумленнасці выканання грамадзянскіх абавязкаў. Але думкі інтэлектуалаў-індывідуалаў XVI—XVII ст. не ўстане адлюстраваць агульныя настроі, усю значнасць і важкасць феномена ўсяго шляхецкага саслоўя. Гэта павінна быць даследаванне, што будуецца праз словы, думкі, погляды значнай колькасці сучаснікаў падзей, якія адкладаліся ў дакументальных крыніцах. Але праз рукі і вочы беларускіх гісторыкаў такія матэрыялы толькі пачынаюць праходзіць. З гэ-

тай прычыны беларуская медыявістыка толькі пачала шлях да фарміравання сваёй думкі і поглядаў на праблемы ролі і месца шляхецтва беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці ВКЛ і Рэчы Паспалітай у XVI—XVII ст. Апошнім часам з’яўляюцца асобныя артыкулы аб ролі прадстаўніцтва ВКЛ у дзейнасці вальнага сойма Рэчы Паспалітай другой паловы XVI ст., яго ўплыву на прыняцці рашэнняў па разнастайных пытаннях унутранай і знешняй палітыкі агульнай дзяржавы[6].

Расійская ды савецкая гістарыяграфія прадстаўлена фундаментальнымі працамі М. К. Любаўскага, У. І. Пічэты, дзе прааналізаваны этапы станаўлення шляхецкага саслоўя ў ВКЛ, працэс узрастання яго палітычнай вагі на працягу XVI ст.[7] Аднак менавіта ў XVI ст. даследаванні вышэйзгаданых аўтараў перапыняюцца. Толькі ў схематычнай форме разглядаў дзяржаўна-палітычны лад, без выдзяленняў канкрэтнай ролі шляхты ў яго функцыянаванні, М. К. Любаўскі. Ім прааналізаваны склад, структура, прэрагатывы вальнага сойма Рэчы Паспалітай. Але велікакняжацкага крыла ў яго дзейнасці з асобнымі поглядамі на агульнадзяржаўныя праблемы і вылучэннем мясцовых пытанняў мэтрам даследчыкам старажытнай гісторыі ВКЛ адзначана не было. Наадварот, расійскі медыявіст паставіў Княства Літоўскае пасля 1 ліпеня 1569 г. на адзін узровень па статусе з Вялікай і Малой Польшчай[8].

Праблемай арганізацыі і функцыянавання прадстаўнічых шляхецкіх органаў улады, соймікаў, што пачалі дзейнасць у ВКЛ з 1565 г. і дапоўнілі парламенцкі інстытут (сойм) парламенцкай сістэмай (соймік — сойм), займаліся расійскія гісторыкі М. А. Максімейка, Ф. І. Леантовіч, І. І. Лапа. Першыя два даследчыкі ў сваіх працах[9] на грунце заканадаўчых дакументаў далі агульную характарыстыку шляхецкіх сходаў з разглядам соймава-соймікавай праблематыкі. Даследаванні І. І. Лапа[10] адзначаюцца фундаменталізмам, панарамным і дакладным асэнсаваннем шляхецкай соймікавай дзейнасці (праца прадсоймавых, рэляцыйных, дэпутацкіх, элекцыйных, попісавых соймікаў). Аўтар таксама звярнуўся, няхай і фрагментарна, да аналізу соймікавых прамоў, што кардынальна адрознівае яго працы ад папярэднікаў і паслядоўнікаў, якія менш увагі ўдзялялі палітычнай дзейнасці шляхты.

У савецкай гістарычнай школе цікавасць да гісторыі ВКЛ з пазіцыі разгляду яго ўнутрыпалітычнай пабудовы, дзяржаўна-палітычных функцый пануючай групы насельніцтва, а тым больш актыўнасці ў соймікава-соймавай дзейнасці ўсходнеславянскага ды яшчэ праваслаўнага насельніцтва, была ідэалагічна затабуіраванай. Толькі ў 90-х гг. XX ст. у зборніку «Еўрапейскае дваранства XVI—XVIII ст.: межы саслоўя» М. Я. Бычковай быў апублікаваны артыкул «Фарміраванне пануючага класа Вялікага княства



Літоўскага ў XVI ст.». На падставе аналізу галоўным чынам юры- дычных норм Статутаў ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг. маскоўская даследчыца вызначыла сацыяльна-эканамічныя, дзяржаўна-палітычныя, канфесійныя фактары саслоўных меж- элітнай знаці, эвалюцыю прававых прывілеяў шляхты, элементы доказнасці належнасці да вышэйшага набілітэта, формы анабліравання і працэс страты шляхецкага статуса з яго наступствамі. Рэгіянальныя асаблівасці шляхты Вялікага княства Літоўскага, а тым больш яго канкрэтная дзейнасць у дзяржаўна-грамадскім жыцці, у даследаванні не разглядаліся ды не ставіліся за мэту[11].

Традыцыйна вялікую зацікаўленасць да ўсіх аспектаў гісторыі элітарнага саслоўя Рэчы Паспалітай выказалі польскія даследчыкі. У абагульняючых працах, якія прысвечаны ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай, велікакняжацкія матэрыялы выступаюць у ролі фактлагічнай канструкцыі, без аналізу асаблівасцей рэальнай сітуацыі. Не засталіся па-за ўвагай медыявістаў заходняй суседкі і такія пытанні, як арганізацыя парламенцкай дзейнасці, адносіны шляхты да існуючай у РП сістэмы ўлады і яе інстытутаў, знешнепалітычных захадаў урада, унутрыпалітычных змен і пачынанняў, шляхецкай палітычнай культуры (Й. Семенскі, Я. Тазбір, Я. Мацішэўскі, В. Крэгзайзен, Э. Апалінскі)[12]. Аднак галоўным аб’ектам вывучэння для польскіх навукоўцаў былі землі Кароны, а калі даходзіла да стану спраў у ВКЛ, то тэматыка звужвалася да асобных праблем (ацэнка дзяржаўнага адзінства РП, абарона ад знешніх ворагаў, фінансава-падатковая палітыка), разглядалася праз прызму бачання польскім бокам і грунтавалася на асобных прыкладах. Шэраг даследаванняў сучасных польскіх гісторыкаў ахопліваюць толькі асобныя кірункі палітычных памкненняў шляхты ВКЛ. Так, праблемы удасканалення дзяржаўнай сістэмы кіравання, вайсковасці, канфесійныя, якія абмяркоўваліся на сойміках ВКЛ у XVII ст., разглядае ў артыкульных публікацыях Г. Візнер[13] (праўда, храналагічныя доследы абмежаваны XVII ст.). Шматаспектна ў плане арганізацыі, функцыянавання, выніковасці вывучае гісторыю соймікаў ВКЛ другой паловы XVI—XVII ст. А. Закжэўскі[14]. У якасці фактлагічнага матэрыяла аўтар выкарыстоўвае асобныя прыклады соймікавай дзейнасці па ўсёй тэрыторыі ВКЛ, але ў якасці базавага аб’екта даследавання абраў Трокскую адміністрацыйную адзінку. Пры гэтым багацейшы матэрыял, як і ключавыя высновы ў А. Закжэўскага па гісторыі мясцовага парламентарызму, датычыцца галоўным чынам другой паловы XVII—XVIII ст. Таму апошняя трэць XVI — першая трэць XVII ст. не павінны выходзіць з-пад даследчыцкай увагі дазнаўцаў даўніны.

У фундаментальнай манаграфіі аднаго з найбольш дасведчаных польскіх гісторыкаў ва ўзаемаадносінах ВКЛ і Каралеўства Польскага другой пало-

вы XVI ст. Г. Люлевіча, якая грунтуецца на шырокаабдымным дакументальным матэрыяле, даследуецца час першых двух дзесяцігоддзяў знаходжання пад адзіным дзяржаўным пачаткам да 1569 г. асобных еўрапейскіх краін. Менавіта праз спектр польска-велікакняжацкіх адносін Г. Люлевічам аналізуюцца ўсе праблемы, што ім выносяцца на разгляд: спроба адміністрацыі і арыстакратыі ВКЛ захаваць за сваёй старажытнай краінай статус асобнага дзяржаўнага чынніка, суб’екта федэрацыі, дзеля чаго арганізуецца самастойнае скліканне галоўных соймаў ВКЛ, а таксама захады па правядзенні асобнага знешнепалітычнага курсу[15]. Што тычыцца пазіцый мясцовага шляхецкага «народа» ў дачыненні да глабальных і мясцовых праблем рэгіёнаў, польскі даследчык, на жаль, не меў мажлівасці дакрануцца.

Папулярную тэму парламентарызму ў якасці самастойнага даследавання ажыццявіў аўтарытэтны знаўца гісторыі Польшчы і ВКЛ А. Рахуба. Яго манаграфія засяроджваецца на праблеме месца ВКЛ у парламенцкай сістэме Рэчы Паспалітай у 1569—1763 гг.[16] Даследчык робіць аналіз структуры дзейнасці інстытутаў парламенцкай сістэмы ВКЛ. Асобная ўвага ўдзяляецца павятовым соймікам, а таксама галоўным соймікам ВКЛ у Ваўкавыску і Слоніме. Аўтар падкрэслівае адрозненні парламенцкай сістэмы ў ВКЛ ад Польскага Каралеўства. Звяртае ўвагу на адметнасць заканадаўча-прававой асновы ВКЛ. Але, як і ў папярэдніх доследах, асноўнае інфармацыйнае поле агортвае галоўным чынам XVII—XVIII ст., таму спецыфічнае паслялюблінскае пяцідзесяцігоддзе застаецца актуальна адкрытым у доследным плане.

Такім чынам, сярод гістарыяграфічных прац адсутнічае сінтэтычнае даледаванне, якое б акрэслівала канкрэтныя сферы палітычных інтарэсаў шляхты беларускіх зямель у 70-я гг. XVI — 20-я гг. XVII ст., узровень яе сацыяльнай актыўнасці, пазіцыі «народа шляхетнага» ў вырашэнні кардынальных праблем тагачаснага грамадства, а таксама элементы палітычнай свядомасці дзяржаўнай эліты.

---

[1] *Доўнар-Запольскі, М. В.* Гісторыя Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі. Мінск, 1994.

[2] *Грицкевич, А. П.* Формирование феодального сословия в Великом княжестве Литовском и его правовые основы (XV—XVI вв.) / А. П. Грицкевич // Первый Литовский статут 1529 года. Вильнюс, 1982; *Грыцкевіч, А. П.* Беларуская шляхта / А. П. Грыцкевіч // Спадчына. 1990. № 1; *Грыцкевіч А. П.* Шляхта Вялікага княства Літоўскага да Люблінскай уніі 1569 г. / А. П. Грыцкевіч // Годнасць. 1993. № 1.



[3] *Юхо, Я. А.* Крыніцы беларуска-літоўскага права / Я. А. Юхо. Мінск, 1991; *Падокшын, С. А.* Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры / С. А. Падокшын. Мінск, 2003; *Сокол, С. Ф.* Социологическая и политическая мысль в Белоруссии во второй половине XVI века / С. Ф. Сокол. Минск, 1974; *Шалькевіч, В. Ф.* Філасофская думка ў Беларусі / В. Ф. Шалькевіч. Мінск, 1976.

[4] *Сокол, С. Ф.* Социологическая и политическая мысль в Белоруссии во второй половине XVI века / С. Ф. Сокол. Минск, 1974. С. 19-20.

[5] *Кавалёў, С. В.* Героіка-элігічная паэзія Беларусі і Літвы канца XVI ст. / С. В. Кавалёў. Мінск, 1993; *Ён жа.* Станаўленне польскамоўнай паэзіі ў полілінгвістычнай літаратуры Беларусі эпохі Рэнесансу. Мінск, 2002; *Саверчан- ка, І. В.* Старажытная паэзія Беларусі. XVI — першая палова XVII ст. / І. В. Са- верчанка. Мінск, 1992.

[6] *Падалінскі, У. А.* Спроба рэвізіі ўмоў Люблінскай уніі з боку Вялікага княства Літоўскага ў 1572—1576 гг. / У. А. Падалінскі // Славянский мир и славянские культуры в Европе и мире: место и значимость в развитии цивилизаций и культур (история, уроки, опыт и современность). Материалы международной научно- технической конференции. Ч. 1. Витебск, 2002. С. 94—97; *Ён жа.* Вялікае княства Літоўскае ў палітычным крызісе Рэчы Паспалітай 1587—1589 гг. // Актуальныя праблемы гісторыгі Беларусі: стан, здабыгкі і супярэчнасці, перспектывы развіцця. Ч. 1. Гродна, 2003. С 184—190.

[7] *Любавскнй, М. К.* Литовско-русский сейм / М. К. Любавский. М., 1900; *Пичета, В. Н.* Белоруссия и Литва в XV—XVI вв. / В. Н. Пичета. М., 1961.

[8] *Любавскнй, М. К.* Политический строй Польши после Люблинской унии. Лекции читанные в Московском университете / М. К. Любавскнй. М., 1901.

[9] *Максимейко, Н. А.* Соймы Литовско-Русского государства до Люблинской унии 1569 г. / Н. А. Максимейко. Харьков, 1902; *Леонтович, Ф. Н.* Веча, сеймы н сеймики в Великом княжестве Литовском / Ф. Н. Леонтович // Журнал Министерства народного просвещения. 1910. № 2, 3.

[10] *Лаппо, И. И.* Великое княжество Литовское за время от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569—1586) / И. И. Лаппо / Опыт исследования политического и общественного строя. Т. 1. СПб., 1901; *Он же.* Великое княжество Литовское во второй половине XVI в. Литовско-русский повет и его сеймик. Юрьев. 1911.

[11] Европейское дворянство XVI—XVII вв.: границы сословия. М., 1997. С. 216—235.

[12] *Siemiecski, I.* Polska kultura polityczna w XVI wieku / I. Siemiecski // Kultura staropolska. Krakyw. 1932; *Tazbir, J.* Kultura szlachecka w Polsce. Rozkwit-upadek- relikty. Warszawa, 1979; *Maciszewski, J.* Szlachta Polska i jej pacstwo. Warszawa. 1986; *Kriegseisen, W.* Sejmiki Rzeczypospolitej szlacheckiej w XVII i XVIII wieku. Warszawa, 1991; *Opalicski, E.* Kultura polityczna szlachty Polskiej w latach 1587—1652. Warszawa, 1995.

[13] *Wisner, H.* Sejmiki litewskie i kwestie wyznaniowe. 1611—1648 / H. Wisner // Odrodzenie i reformacja w Polsce. 1978. R.

XXIII. S. 123—150; Wojsko Wielkiego ksiкstwa Litewskiego. Czasy Zygmunta III i Wladyslawa IV // Zeszyty naukowe wyzszej



szkoiy pedagogicznej w Opolu. 1988. T. XXVI. S. 217—233; Naprawa paсstwa w uchwaiach sejmikyw Wielkiego Ksiкstwa Litewskiego w pierwszej polowie XVII w. // Studia polsko-litewsko-biaioruskie. Warszawa, 1986. S. 33—50.
[14] *Zakrzewski, A.* Sejmiki Wielkiego ksiкstwa Litewskiego (poiowa XVI — koniec
XVIII w. / A. Zakrzewski // Parlamentaryzm w Polsce we wspyiczesnej historiografii. Warszawa, 1995. S. 100—106; M arszai ek pow iatowy Wielkieg o Ksiкstwa Litewskiego — marszaikiem sejmikowym (XVI—XVIII w.) // Parlament, prawo, ludzie. Warszawa, 1996. S. 356—361; Ograniczen ie przez sejmiki Wielkiego Ksiкstw a Litewskiego monarszego prawa mianowania urzкdnikyw s№dowych. XVII—XVIII w. // Lietuvos Valstybй XII—XVIII a. Vilnius, 1997. S. 173—186.
[15] *Lulewicz, H.* Gniew o unie ci№q dalszy. Stosunki polsko-litewskie w latach 1569—1588 / H. Lulewicz. Warszawa, 2002.
[16] *Rachuba, A.* Wielkie Ksiкstwo Litewskie w sistemie parlamentarnym Rzezypospo- litej w latach 1569—1763 / A. Rachuba. Warszawa, 2002.